Святы ад болю ў горле

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
24.01.2021 00:00



Праз заступніцтва св. Блажэя, біскупа і мучаніка, няхай Бог захавае цябе ад хваробы горла і ўсякай іншай немачы. У імя Айца і Сына, і Святога Духа. Раз на год падчас Эўхарыстыі адбываецца адзін з самых цікавых абрадаў. Пасля заключнай малітвы святар запальвае 2 спецыяльныя свечкі. Затым рыхтуе вернікаў да ўдзелу ў адмысловым бласлаўленні, прамаўляючы: “Папросім Бога, які з’яўляецца крыніцай жыцця, аб здароўі горла і правільным выкарыстанні дару мовы, каб мы маглі прымяняць яго на хвалу Божую і на карысць людзям”. †

Гэтае бласлаўленне, прынятае ў духу веры 3 лютага, у дзень літургічнага ўспаміну св. Блажэя, біскупа і мучаніка, павінна абараніць ад усіх хвароб горла, а таксама ад інфекцыі і зубнога болю.

Да



св. Блажэя молімся таксама аб здароўі сваёй мовы. Просім ахоўваць наш язык ад граху

абгаворвання, плётак, асуджэння і здзекаў. Просім стаяць на варце нашых вуснаў і дапамагаць прамаўляць добрыя словы: суцяшэння, клопату, падбадзёрвання і любові. Звяртаемся да святога за дапамогай, калі хочам славіць Бога сваімі словамі. Св. Блажэй дапамагае нашай мове быць інструментам любові і дабра.

Няма гістарычных сведчанняў, адкуль пайшоў звычай бласлаўляць свечкі ў дзень літургічнага ўспаміну святога. Аднак існуе шмат розных легенд, асабліва ва Усходніх Цэрквах. Адна з іх сцвярджае, што сваёй малітвай св. Блажэй выратаваў ад удушша хлопчыка, у якога ў горле застрала костка. Яшчэ магчыма, што Блажэй, перш чым стаць святаром, быў лекарам. Ён таксама з'яўляўся біскупам Себасты. Нягледзячы на пагрозы і заклікі да адступніцтва, біскуп Блажэй цярпліва зносіў катаванні і быў жорстка забіты за веру прыблізна ў 316 годзе, падчас праўлення імператара Ліцынія.

Св. Блажэй з'яўляецца заступнікам урачоў, пекараў, вытворцаў воску, ткачоў, гандля

Далучыўся да мучанікаў, якія па прыкладзе Езуса аддалі сваё жыццё за паству, даверануюім уваскрослым Панам.

Звяртаючыся да заступніцтва святога з Сабасты, мы бласлаўляем горла, разлічваючы на яго вылячэнне. Аднак трэба мець яшчэ вялікую веру. Веру, як у кіраўніка сінагогі Яіра, які так добра ведаў Езуса і так давяраўся Яго моцы, што чакаў абсалютна па-людску немагчымага: што Езус, калі толькі захоча, верне жыццё яго любімай маленькай дачушцы. Што ўрэшце стала фактам. Трэба мець веру змучанай жанчыны, якая 12 гадоў пакутавала ад крывацёку і траціла ўсю маёмасць на лекараў, а ў выніку адчувала сябе яшчэ горш (параўн. Мк 5, 21–43). Тым не менш, яе натхняла надзея: была гатова змагацца да канца, пакуль нарэшце Езус не заўважыў яе веру і не выканаў жаданне сэрца.

Хрыстос сёння падобным чынам рэагуе на нас. Адразу ж устае і прыходзіць, калі хтосьці звяртаецца да Яго з просьбай. Без прамаруджвання кідаецца на дапамогу. І тады, і сёння чалавечая бяда і адданая вера, а таксама выказаныя просьбы глыбока кранаюць Езуса. Таму будзьма – без усялякіх перашкод і сумненняў – людзьмі вялікіх жаданняў і непахіснай надзеі. Не дазвольма засланіць ад нас ці адабраць вялікія даброты, абяцаныя Панам.